*І. А. Алексніна, дацэнт*

# ТЭАТРАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я: АСПЕКТЫ ДУХОЎНАСЦІ І МАРАЛІ

Асаблівасцю даследуемага рэгіёна Беларусі (Браслаўскі, Шаркаўшчынскі, Глыбоцкі, Докшыцкі, Пастаўскі і Міёрскі раёны Віцебскай вобласці) з'яўляецца тое, што, як і 10 гадоў таму, у ім не працуе ніводнага прафесійнага тэатра. Тэатральнае мастацтва развіваецца тут пераважна ў аматарскай форме, але мае глыбокую і слаўную гісторыю, працягвае адыгрываць вядучую ролю ў фарміраванні і замацаванні маральна-эстэтычных і духоўных каштоўнасцей жыхароў Заходняга Паазер'я. Спынімся больш падрабязна на тых аспектах, якія адыгралі пэўную ролю ў фарміраванні і замацаванні духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый жыхароў вызначанага рэгіёна на мяжы XIX – першай паловы XX ст., у прыватнасці мы маем на ўвазе творчую дзейнасць славутага батлеечніка Патупчыка з Докшыц.

Сезон тэатральных паказаў беларускіх батлеечнікаў распачынаўся ў першы дзень калядных свят і доўжыўся да 6 лютага. Аднак селянін па паходжанні, выдатны прафесіянал-батлеечнік, артыст-самародак Патупчык разам са сваёй жонкай і сынам, якія ў асноўным працавалі з лялькамі, ладзіў паказы на працягу года, асабліва ў дні сельскагаспадарчых кірмашоў (фэстаў).

Майстэрства батлеечніка – найбольш сінтэтычнае з усіх відаў тэатральнай творчасці. У ім сканцэнтраваны багацейшы мастацкі вопыт народа. Авалоданне ім вымагае значных рэжысёрскіх, акцёрскіх (нягледзячы на тое, што спектаклі іграліся з выкарыстаннем лялек) здольнасцей, сцэнарна-драматургічных навыкаў, валодання дарам імітацыі і імправізацыі, значнага мастацка-прыкладнога і музычнага таленту. Галоўную ролю ў батлеечным прадстаўленні выконваў тэкст, які вымаўляў кіраўнік-імправізатар. У залежнасці ад складу глядацкай аўдыторыі, яе

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

светапоглядаў лялечнік мог вар’іраваць драматургічна-сцэнарнай асновай прадстаўлення, узмацняць ці, наадварот, паслабляць сваю ацэнку падзей, пра якія ідзе гаворка ў паказе.

Патупчык дасканала валодаў неабходным для гэтага талентам. Рэпертуар яго тэатра складаўся як з пастановак на тэмы біблейскіх і евангельскіх сюжэтаў, так і з інтэрмедый (пераважна бытавога зместу). Інтэрмедыі іграліся асобна ад рэлігійных прадстаўленняў. Акрамя таго, у час правядзення кірмашоў яго спектаклі былі своеасаблівай “жывой газетай”. Батлеечнік добра ведаў навіны павета, побыт і жыццё амаль кожнага местачкоўца, што складала асноўную канву яго паказаў. Тэкст прадстаўлення ствараўся самім Патупчыкам, што рабіла спектаклі актуальнымі, надзённымі, максімальна блізкімі і зразумелымі гледачу. Значнае месца ў складзе рэпертуару яго тэатра займалі пастаноўкі паводле народных песень (“Варабей, варабей, ня клюй маіх канапель”, “Гоп, гоп, Ясю, куды ж ты паехаў?” і інш.), а таксама творы, накіраваныя супраць сацыяльнай несправядлівасці. У адным са спектакляў батлеечнік іншасказальна гаворыць “... пра карысць жывёлагадоўлі і пра выкарыстанне арганічных угнаенняў” [1]. Майстэрства Патупчыка служыла задавальненню мастацка-эстэтычных запатрабаванняў працоўнага люду і культурна-асветным мэтам. У час прадстаўленняў ён быў своеасаблівым канферансье, пасрэднікам паміж сцэнай і гледачамі, падрабязна тлумачыў сялянам змест кожнай сцэны і паводзіны герояў [1].

Тэматычная разнапланавасць рэпертуару, сацыяльна-бытавая мэтанакіраванасць пастановак, імкненне адлюстраваць сучасныя батлеечніку падзеі далі магчымасць вывесці на сцэну лялечнага тэатра такіх дзеючых асоб, як сяляне, памешчыкі, земскія прыставы, злодзеі, гарадавыя, шынкары. Пры гэтым у час вырабу лялек назіральны народны майстра, мастацка-дэкарацыйныя работы якога можна з поўным правам аднесці да плыні “наіўнага”, “інсітнага” мастацтва, імкнецца надаць батлеечным героям знешняе падабенства з рэальнымі асобамі. Для рэлігійных прадстаўленняў, якія даваў Патупчык для святароў у час фэстаў і ў дамах местачковага начальства, ён капіраваў персанажаў з лубачных малюнкаў, а

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

«... апосталаў і вешчуноў ставарае па “вобразу і падабенству” мясцовага служкі культу і тых святароў, якія прыязджалі на фэст» [1]. Многія пастаноўкі Патупчыка мелі выхаваўчы характар, таму што кожная лялька, старанна апрацаваная майстрам, была максімальна набліжана да таго вобраза, які, на думку батлеечніка, заслугоўваў увагі грамадскасці.

Лялькі выраблялі з дрэва, фарбаваліся і замацоўваліся на дроце. “Ваджэнне лялек адбывалася па прарэзах у днішчах сцэн абодвух паверхаў. Але асобныя з іх, якія па ходу дзеяння рабілі паклоны, – лялькі чараўнікоў, біблейскіх герояў і падхалімаў, надзяваліся на палец сярэдняй рукі” [1].

Сярод найбольш запамінальных вобразаў батлейкі Патупчыка былі паданыя ў сатырычных фарбах гарадавы-хабарнік Мікіта, які фігураваў амаль у кожнай пастаноўцы, і хамелеон-земскі Арскі. Іншым героем паўстае хітры злодзей, які дапамагае сялянам вярнуць іх скацінку, якую пан Гурыновіч забраў сабе за патраву яго палёў (“Як злодзей быкоў у лапці абуваў”). Асабліва вострай па сацыяльным гучанні з’яўлялася сцэнка “Пра пані Мальвіну і маліну”. Найбольш значным па сэнсе быў эпізод паказу пакут, якія церпіць пані Мальвіна на тым свеце за тое, што яна загадала свайму лакею забраць у дзяўчат ягады, сабраныя ў яе лесе.

Батлейка Патупчыка ўяўляла простую двухпавярховую скрыню, дастаткова вялікіх памераў (прыкладна 1,5 х 1,5 м.), мела дзве заслоны. Над першай размяшчаліся пеўні, якія давалі сігнал да пачатку прадстаўлення. Пасля гэтага адчынялася другая заслона, і на сцэне з’яўляліся дзеючыя асобы. Знешне скрыня была ўпрыгожана выцінанкай, зробленай жонкай Патупчыка [1].

З-за таго, што пастаноўкі былі двухактавымі, яго батлейка мела верхні і ніжні ярусы, што давала магчымасць максімальна хутка змяняць дэкарацыі, пазбягаць разрыву лініі дзеяння і парушэння тэмпарытму спектакля, якія ўзнікалі ў прадстаўленнях іншых батлеечнікаў Беларусі. Дастаткова арыгінальным было і дэкарацыйнае афармленне батлейкавай сцэны. Дэкарацыі малявалі на папяроснай паперы і замацоўвалі на бакавінах сцэны. Асобныя невялікія прадметы ляпіліся разагрэтым воскам да дна скрыні. Змена дэкарацый адбывалася па два разы ў ходзе спектакля [1].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Дастаткова прафесійным быў прынцып асвятлення батлейкі. Святло давалі свечкі, замацаваныя на ўстаўных планках у бакавінах скрыні. Пры гэтым была прадугледжана проціпажарная бяспека ў час паказаў. У мэтах узмацнення і рэгуліроўкі святла ў камерах са свечкамі зверху замацоўваліся вузкія палоскі люстэркавага шкла.

Музычнае афармленне спектакляў здзяйсняў сам Патупчык, які, па сведчаннях сучаснікаў, быў і выдатным скрыпачом.

Прадстаўленні докшыцкага лялечніка, згодна ўспамінам А.Дзяшавага, былі глыбока народнымі, з каларытнай мовай, пранізаныя вострай крытыкай адмоўных грамадскіх з'яў. Сведка называе яго творчасць самабытнай. Тэатр Патупчыка ведалі і любілі не толькі сяляне, але і дэмакратычна настроеная моладзь. Не карысталася яго мастацтва сімпатыяй толькі сярод тых, чые непрыстойныя паводзіны іранічна высмейваў у сваіх пастаноўках батлеечнік. Бывалі выпадкі знішчэння яго лялек.

Творчая дзейнасць батлеечніка Патупчыка ўвайшла ў гісторыю нацыянальнага тэатральнага мастацтва як з'ява пераходная, якая знаходзілася на стыку народнага і прафесійнага мастацтва. Тэатр Патупчыка спалучаў сінтэз рэлігійнага і народнага, высокадухоўнага тэатра, быў выключнай з'явай не толькі для беларускага мастацтва, але і ў параўнанні з іншанацыянальнымі тэатрамі гэтага тыпу, польскай шопкай і ўкраінскім вяртэпам.

Даволі пашыранай з'явай рэлігійнага тэатра на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у тым ліку і даследуемага рэгіёна, у пачатку XX ст. былі паказы "жывой батлейкі". Нам пашчасціла знайсці дакументальныя пацвярджэнні гэтай цікавай тэатральна-духоўнай з'явы. У іх ліку ёсць сведчанні пра дзейнасць навучэнцаў і выкладчыкаў гімназіі пры кляштары айцоў Марыянаў у Друі Браслаўскага павета (1920–1930-я гг.), якія пад кіраўніцтвам ксяндза Анджэя Цікоты ставілі не толькі драматычныя спектаклі, але і ажыццяўлялі калядныя паказы – "батлеі" [3]. Прадстаўленне адбывалася ў "жывым выкананні", без выкарыстання лялек. У адрозненне ад школьных тэатраў пры кляштарах і калегіумах XVIII ст. у друйскіх паказах не было вольных імправізацыйных сцэн.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Фотаздымкі адной з такіх пастановак (1927) уяўляюць дзейных асоб: трох каралёў, пастушкоў, анёлаў, Іосіфа, маці Марыю, маленькага Езуса.

Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што на мяжы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Заходняга Паазер'я значную ролю ў фарміраванні духоўных і маральна-этычных каштоўнасцей адыгралі менавіта батлеечныя прадстаўленні як ў лялечным, так і "жывым выкананні". На жаль, на сённяшнім этапе развіцця тэатральнага мастацтва гэтая мабільная і найбольш даступная для непадрыхтаванага гледача форма паказу як у адзначаным рэгіёне, так і на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўваецца даволі рэдка.

---

*1.* Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, ф. 1, воп. 1, спр. 6, л. 8–15.

*2. Тэатральная* Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / пад агульнай рэд. А.В.Сабалеўскага.– Мн.: БелЭН, 2002. – Т. 1. – 566 с. – С. 98–101, 367.

*3. Alma* mater druiensis: wspajaly w dusze idealy nigdy nie odeszlismy od ciebie. – 1986. – № 3. – Cz. 2. – 327 s.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ